# КРАЯЗНАЎСТВА – АСНОВА ФАРМІРАВАННЯ ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАГА І ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

***І.Р. Корзун,*** *настаўніца рускай мовы і літаратуры,*
*педагог дадатковай адукацыі*
*ДУА "Лышчанская сярэдняя школа", Пінскі раён*

*Любіць родную зямлю –*
*гэта добрая справа,*
*але трэба мецьна ўвазе,*
*што родная зямля – гэта…*
*і тая мясціна, дзе чалавек*
*нарадзіўся і вырас,*
*і…зямля таго народа,*
*сынам якога ты з'яўляешся.*
К. Крапіва

На сённяшні дзень вострай праблемай удасканалення выхаваўчай работы ў школе з'яўляецца вызначэнне асноўных напрамкаў яе практычнага ажыццяўлення. Сярод іх вядучае месца займае фарміраванне ў вучняў духоўна-маральных якасцяў, патрыятызму, любові да Айчыны, да сваёй малой радзімы.

Распачатае ў нашай краіне рэфарміраванне агульнаадукацыйнай школы мае на мэце адраджэнне і ўстанаўленне нацыянальнай сістэмы адукацыі, якая грунтуецца на векавечным укладзе жыцця і побыце свайго народа, а таксама карэннае паляпшэнне работы педагагічнага калектыву па павышэнні ўзроўню выхавання падрастаючай змены, максімальнае выкарыстанне ўсіх фактараў, якія аказваюць уплыў на фарміраванне чалавечай асобы. Да такіх фактараў належаць матэрыяльныя, маральныя і псіхалагічныя ўмовы, у якіх растуць і развіваюцца нашы вучні, тое нацыянальнае этнічнае асяроддзе, дзе адбываецца станаўленне юнай асобы.

Менавіта духоўна-маральнае і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне на сучасным этапе павінна стаць стрыжнёвай лініяй у працэсе правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў для вучняў. Яму наканавана стаць тым сродкам, які абароніць моладзь ад шкоднага ўплыву сучаснай масавай культуры, нігілізму і абыякавасці, эгаізму і бязлітаснасці, якія нярэдка сустракаюцца ў школе. Нельга не пагадзіцца з акадэмікам Дз. С. Ліхачовым, які пісаў: "Любоў да роднага краю, веданне яго гісторыі – аснова, на якой толькі і можа ажыццяўляцца рост духоўнай культуры грамадства".

Духоўна-маральнае і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне ўключае ў сябе сістэму шматграннай навучальнай і пазнаваўчай работы, звязанай з фарміраваннем у вучняў пачуцця прывязаннасці да тых месцаў, дзе яны нарадзіліся і выраслі, паважлівага стаўлення да гісторыі Радзімы, традыцый свайго народа. Пры правядзенні гэтай работы вялікую ролю адыгрывае краязнаўства, якое спрыяе выхаванню маралі маладой асобы, годнасці і адказнасці за сваю Радзіму, яе гісторыю, садзейнічае фарміраванню разумення нацыянальнай культуры, яе каштоўнасцей. Далучэнне вучняў да культурна-гістарычнай спадчыны сваёй Радзімы — важны сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. На жаль, сучасная інфармацыя часам нясе духоўнае спусташэнне, паказвае свет нерэальнасці. Яна не звязвае нас з мінулым народа, аддаляе ад унікальнай традыцыйнай культуры, ад яе самабытнасці , ад багатай гістарычнай спадчыны продкаў (за выключэннем некаторай), але і тая, што ёсць, не можа ў поўнай меры раскрыць і паказаць тое народнае багацце, якое захоўвае наша зямля.

Таму школа накіроўвае сваю працу на духоўна-маральнае і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне асобы, якое праяўляецца ў палітычнай культуры і паводзінах

людзей, у ступені іх дачынення да гістарычнага лёсу сваёй Бацькаўшчыны, у імкненні развіваць і памнажаць нацыянальныя традыцыі і культуру. Мэтай такой працы з'яўляецца стварэнне сістэмы работы па фарміраванні асобасных якасцей школьніка, да якіх адносяцца нацыянальная самасвядомасць, пачуццё ўласнай годнасці і патрыятызму. Яны не з'яўляюцца спадчыннымі і не даюцца пры нараджэнні, а назапашваюцца і складваюцца ў працэсе жыцця і могуць развівацца ў тым ці іншым накірунку.

Выхаванне духоўнасці і патрыятызму даволі востра адчуваецца ў дзень сённяшні. Як шкада, што ў школе няма прадмета па выхаванні духоўнасці, патрыятызму, мужнасці. Аднак, ён ёсць у жыцці. І адзнаку яму ставіць само жыццё. Праўда, есць факультатыўныя заняткі па фарміраванні праваслаўнай культуры ў вучняў, уведзены пасады намеснікаў па патрыятычнаму выхыванню. Але ж, пагадзіцеся, ці ў сілах яны выконваць усе запатрабаванні сучаснасці?!

Вывучэнне гісторыі і культуры свайго краю іграе велізарную ролю ў выхаваўчай рабоце з вучнямі. Выхаванне патрыятызму ў дзяцей пачынаецца першым чынам з любові да сваёй хаты, сяла, у якім яны жывуць, да людзей, якія іх насяляюць. Выхаванне на гістарычных традыцыях – найважнейшая задача і ўмова маральнага, патрыятычнага, інтэрнацыянальнага і працоўнага станаўлення падрастаючага пакалення. Прабел у душах нашай моладзі можа запоўніць краязнаўства. Вывучэнне роднага краю – гэта не толькі пазнанне сваёй мінуўшчыны, але і духоўна-маральнае і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне. Пра гэта ў свой час пісала Т.А.Ільіна: "Выхаванню любові да роднага краю спрыяе школьнае краязнаўства, якое пашырае інтарэс да нацыянальнай культуры, да гістарычна ўсталяваных нацыянальных звычаяў, традыцый, цікавых маляўнічых абрадаў". І сапраўды, цяпер, калі на выхаванне моладзі накіраваны ўсе сілы, школа павінна заахвоціць вучняў стварыць такую атмасферу, каб яны самі праяўлялі ініцыятыву, самі ўключаліся ў пошукавую дзейнасць і самі знаходзілі шляхі вырашэння пэўных праблем. Толькі тады работа будзе эфектыўнай, калі вучні будуць не толькі выканаўцамі, але і арганізатарамі пошукавай дзейнасці, а настаўнік будзе каардзініраваць іх дзеянні, накіроўваць у правільным напрамку.

Важнай умовай развіцця краязнаўства з'яўляюцца сучасныя сацыяльна-палітычныя змены, калі ўмацоўваецца беларуская дзяржаўнасць, расце роля "правінцыі", калі ўзрастае цікавасць беларусаў, моладзі да свайго гістарычнага мінулага, народных звычаяў і традыцый, праблем развіцця і адраджэння не толькі сваёй самабытнасці, але і далучэння да хрысціянскіх каранеў.

У цяперашні час гістарычнае краязнаўства мае больш шырокія магчымасці. Адным з ключавых кірункаў становіцца вывучэнне пэўных чалавечых лёсаў, у першую чаргу "блізкіх" людзей-землякоў і членаў сям'і, вывучэнне штодзённага жыцця з яго жывымі падрабязнасцямі. З'явілася магчымасць слухаць і запісваць успаміны і аповеды тых, хто шматлікія гады змушаны быў маўчаць.

Краязнаўства – заўсёды любоў да роднай зямлі. Яно ўзбуджае цікавасць і выхоўвае павагу да вытокаў нашых, да роднай зямлі…Яно ўздзейнічае і на розум наш, і на душу. Дзякуючы краязнаўству, вучань мае магчымасць глыбей зразумець, што гісторыя – гэта гісторыя людзей; карані чалавека – у гісторыі і традыцыях сваёй сям'і, свайго народа, у мінулым роднага краю і краіны. Падчас гістарычнага працэсу з пакалення ў пакаленне перадаюцца вечныя, непераходзячыя каштоўнасці: працавітасць, сумленнасць, справядлівасць, пачуццё нацыянальнай годнасці, сяброўства паміж народамі, павагі да старэйшых пакаленняў, абавязку, літасці, пачуццё гаспадара; праца – асноўная крыніца духоўнага і матэрыяльнага багацця і дабрабыту чалавека, умова паспяховага развіцця грамадства.

Краязнаўства – гэта вялікая і карпатлівая праца. Але не пад прымусам, а добраахвотна. І толькі тады, калі вучні самі зацікавяцца гісторыяй сваёй зямлі, сваіх землякоў, звычаямі і традыцыямі не аднаго пакалення, якія пакінуты нам у спадчыну, толькі тады мы зможам гаварыць пра духоўнае і нацыянальнае адраджэнне нашага народа. Якая ж роля тут адводзіцца настаўніку? Настаўнік павінен накіраваць дзейнасць вучняў на

правільны шлях, раскрыць метады і прыёмы, якія дапамогуць вучням у іх нялёгкай, але такой цікавай справе. І гэта ўдаецца настаўнікам, класным кіраўнікам нашай школы: вучні сапраўды зацікавіліся гісторыяй сваёй вёскі. І не толькі зацікавіліся, але і накіравалі сваю працу на тое, каб больш падрабязна даведацца пра яе культуру, багатыя звычаі і традыцыі, якія маюць старажытныя карані, пра яе людзей, знакамітых і незнаёмых, пра ўсё тое новае, што стваралася ў нашай вёсцы на працягу доўгага часу, на гісторыю ўзнікнення праваслаўнай царквы ў нашай весцы.

Важная састаўная частка сістэмы краязнаўства ў школе – змест краязнаўчых ведаў. Акрамя таго, што я з’яўляюся настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў школе, я яшчэ працую педагогам дадатковай адукацыі іменна па краязнаўчым накірунку. Мая праца заключаецца ў тым, каб дапамагчы вучню зразумець значнасць тых ці іншых працэсаў гісторыі і культуры сваёй вёскі ў гістарычным працэсе нашай краіны.

На занятках аб’яднання па інтарэсах “Сузор’е” стараюся, каб вучні не толькі бачылі межы кругоў дзейнасці, але і, галоўнае, разумелі неабходнасць іх адзінства, інтэграцыі, "празрыстасць" іх межаў, магчымасць і неабходнасць сталага пераходу з аднаго круга ведаў у іншы, важнасць і мэтазгоднасць сталай сувязі блізкага з далёкім, вяртанні ад далёкага да блізкага.

Напрыклад, вывучаючы свой радавод, вучні звязваюць яго з гісторыяй сваёй вёскі, магчыма, краіны і, наадварот, знаёмячыся з гісторыяй дзяржавы, яны вяртаюцца да фактаў гісторыі роднай вёскі, сям'і.

Школьнае краязнаўства садзейнічае ўмацаванню сувязі школы з жыццём, тэорыі з практыкай, атрыманню вучнямі больш трывалых і глыбокіх ведаў. Арганізацыя краязнаўчай работы ў школе, комплекснае вывучэнне гісторыі, звычаяў і абрадаў, рамёстваў свайго краю, яго праваслаўнага мінулага, уцягненне ў гэту справу ўсіх вучняў – адна з высакародных задач кожнага настаўніка.

Тысячы вучняў сельскіх і гарадскіх школ Беларусі ўдзельнічаюць у турысцка-краязнаўчым руху. Разнастайныя праграмы руху, па якіх працуюць юныя краязнаўцы-даследчыкі нашай школы: летапіс роднага краю, землякі, знікшыя помнікі, археалогія, культурная і духоўная спадчына, этнаграфія, ваенная гісторыя, мірныя будні, Вялікая Айчынная вайна, дзеці і вайна, гісторыя дзіцячага руху і іншыя. Нашы вучні прымалі і прымаюць самы актыўны ўдзел у турысцка-краязнаўчым руху.

Краязнаўчыя экспедыцыі вучняў аб’яднання па інтарэсах “Сузор’е” ставілі і ставяць перад сабой мэту: пошук і даследаванне гістарычных, праваслаўных, этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў, знаёмства з рознымі людзьмі нашай вёскі, выяўленне асаблівасцей развіцця роднага краю ў пэўныя перыяды жыцця вёскі. Удзельнікі экспедыцый займаюцца даследчай і пошукавай працай, вучацца вызначаць адметнасць і самабытнасць культурнага асяроддзя мясцовасці, вывучаюць іх уплыў на нацыянальную і агульначалавечую культуру. Вучні займаюцца аналізам фактаў і з'яў, сістэматызуюць матэрыял адносна яго месца і часу, знаходзяць сувязі паміж традыцыйнай культурай народа і мясцовымі звычаямі і абрадамі, што спрыяе іх духоўнаму ўдасканаленню, развіццю мыслення і адказнасці за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны.

Дзейнасць у гэтым накірунку прадугледжвае даследаванне гісторыі школы, вёскі, вывучэнне жыцця і дзейнасці вядомых землякоў, збор археалагічных, этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў. Істотнай дапамогай у вывучэнні гісторыі Бацькаўшчыны з’яўляюцца мясцовыя летапісы. Яны дазваляюць вучням параўноўваць вядомыя гістарычныя падзеі з падзеямі, што адбываліся ў гэты час у іх родных мясцінах. Падчас даследаванняў роднага краю вучні ўдзельнічаюць у краязнаўчых, этнаграфічных экспедыцыях, займаюцца актыўнай працай у архівах, бібліятэках. Намаганнямі юных краязнаўцаў – удзельнікаў экспедыцыйных груп арганізуюцца сустрэчы, краязнаўчыя віктарыны з удзелам мясцовых краязнаўцаў.

Рэзульт пошукавай працы – гэта праекты, даследчыя працы па розных накірунках “Праваслаўныя святыні малой радзімы”, “Крыніцы духоўнасці”, летапісы вескі, школы,

піянерскай дружыны, “Таленты нашай вескі”, “Скарбонка роднага краю”, “Таямніцы старажытных узораў”, “Справа ўсяго жыцця” і інш. Кожны год мы прымаем удзел у розных конкурсах, маем узнагароды не толькі на ўзроўні раена, але і вобласці, і рэспублікі.

Лічу, што вельмі важна, каб вучні памяталі аб сваіх вытоках, аб пераемнасці пакаленняў, непарыўнай сувязі часоў, каб спазнанне мінулага акультурвала, і каб гонар кожнага чалавека за сваю малую радзіму, за яго родны край не пакідаў ніколі. І каб усе лепшыя чалавечыя якасці, якія перайшлі нам у спадчыну за шматлікія стагоддзі, прарасталі дужымі і надзейнымі парасткамі ў душах і характарах сучаснікаў, у іх паўсядзённых справах. З думкамі і аб малой радзіме, аб роднай хаце, сям'і, аб магілах родных і блізкіх звязаны ў свядомасці нашых людзей іх уяўленні аб Айчыне.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Емельяновіч В.М. Тапанімічны гурток // Народная асвета. – 1987.– № 6. – С. 52–55.
2. Лепешев И.Я. Литературно-краеведческий кружок. – Минск, 1970.
3. Ляшук В. Літаратурнае краязнаўства ў школе. – Мінск, 1991.
4. Строев К.Ф.Краеведение. – М., 1974.
5. Урбановіч У.А. Шляхамі паэтаў і герояў. – Мінск, 1970.
6. Чорны Д.М. Краязнаўчая работа ў школе. – Мінск, 1976.